**МІНСК – КУАЛА-ЛУМПУР**
Беларускія студэнткі
пра свой досвед вучобы ў Малайзіі
Стар. 2

**ДЫНАСТЫІ БДУ**
Цыкл матэрыялаў, прысвечаны дынастыям
студэнтаў і выкладчыкаў БДУ
Стар. 4-5

**80 ГАДОЎ НА СЦЭНЕ І Ў СЭРЦЫ БЕЛАРУСІ**
Заслужаны аматарскі калектыў
Рэспублікі Беларусь – ансамбль танца
«Крыжачок» БДУ адзначыў важную дату
Стар. 6-7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

18 чэрвеня 2025 года, №6 (2297)

# ВЕКТАР НА ЎСХОД: БДУ ПАШЫРЫЎ ПАРТНЁРСТВА З КІТАЙСКІМІ ВНУ



**Афіцыйны візіт дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём у КНР прадугледжваў шэраг дамоўленасцяў з ВНУ гэтай краіны з мэтай пашырэння партнёрства ў галіне навукі і адукацыі, а таксама ўмацавання трывалых сувязяў.**

## БДУ СТАЎ АДНЫМ З АРГАНІЗАТАРАЎ ПЕРШАГА МІЖНАРОДНАГА ФОРУМУ ПА ГУМАНІТАРНЫМ АБМЕНЕ Ў КІТАІ

Маштабнае мерапрыемства – стартавая калектыўная ініцыятыва адкрытага 11 мая сумеснага Кітайска-беларускага цэнтра гуманітарных абменаў на базе БДУ, МДЛУ і Пекінскага ўніверсітэта замежных моў (ПУЗМ). Цырымонія адкрыцця адбылася падчас афіцыйнага візіту дэлегацыі БДУ на чале з **рэктарам Андрэем Каралём** у КНР.

На пленарным пасяджэнні форуму рэктар БДУ нагадаў пра сумесную з ПУЗМ працу па адкрыцці цэнтра:

– Яго стварэнне было ўключана ў План супрацоўніцтва паміж урадамі Беларусі і КНР у рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. З кітайскімі калегамі мы дэталёва прапрацоўвалі арганізацыйныя, фінансавыя пытанні, вызначалі прыярытэтныя напрамкі сумеснай дзейнасці. Упэўнены, цэнтр стане ключавой структурай па лініі гуманітарнага ўзаемадзеяння дзвюх краін, – канкрэтызаваў Андрэй Кароль.

Удзельнікамі форуму выступілі прадстаўнікі кітайскіх і беларускіх міністэрстваў, ведамстваў і пасольстваў, кіраўнікі і супрацоўнікі ВНУ – заснавальнікаў цэнтра, выкладчыкі шэрагу кітайскіх універсітэтаў. Ключавымі тэмамі форуму заяўлены сучасны стан і перспектывы гуманітарнага абмену паміж Беларуссю і Кітаем; пабудова механізмаў працы вышэйназванага цэнтра; даследаванне ўзаемадзеяння і ўзбагачэння цывілізацый краін Еўразіі.

## БДУ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У ШТОГАДОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЎНІВЕРСІТЭТА ШАС

Маштабнае мерапрыемства прайшло ў г. Урумчы (Сіньцзян-Уйгурскі аўтаномны раён КНР). У адкрыцці і пленарнай сесіі ўдзельнічалі міністры адукацыі і рэктары ВНУ дзяржаў – членаў ШАС.

На канферэнцыі разгледзелі асноўныя вынікі дзейнасці УШАС у 2020–2024 гадах і ініцыятыву «Развіццё лічбавай адукацыі УШАС». Таксама ў рамках мерапрыемства прайшоў Форум рэктараў краін – членаў ШАС на базе Сіцзянскага ўніверсітэта, дзе была арганізавана праца трох секцый: «Лічбавізацыя навучання», «Інтэграцыя адукацыі і прамысловасці», «Устойлівае і працяглае развіццё». Дарэчы, на першай з іх Андрэй Кароль прадставіў даклад «Штучны інтэлект у люстэрку адукацыі: праблема дыялогу».

У сваім выступленні рэктар БДУ зрабіў акцэнт на ўплыве лічбавізацыі на адукацыю, у прыватнасці, штучнага інтэлекту. Гэтыя змены адлюстроўваюцца на патрабаваннях да кампетэнцый будучых спецыялістаў, змесце адукацыйных праграм і адказваюць на пытанні «Навошта вучыць?», «Чаму вучыць?» і «Як вучыць?». Таксама лічбавізацыю важна разглядаць у кантэксце яе перспектыўнасці ў раскрыцці, рэалізацыі патэнцыялу і місіі студэнта.

Андрэй Кароль адзначыў, што штучны інтэлект з пазіцыі педагогікі выклікае вялікія асцярогі. Рэктар прывёў навуковыя доказы зніжэння кагнітыўных здольнасцяў у карыстальнікаў штучнага інтэлекту. Паводле яго разважанняў, чалавек страчвае сваю шматграннасць, пачынае думаць як рукатворны інтэлект, выдае «адзіна правільны адказ».

Рэктар нагадаў, што ў БДУ паспяхова працуе сістэма крэатыўнай адукацыі. Яна накіравана на ўкараненне інавацыйных адукацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць індывідуалізацыю адукацыйнай траекторыі навучэнцаў і дыялагічнасць навучальнай камунікацыі.

## ПАКЕТ ДАКУМЕНТАЎ ПАДПІСАЎ БДУ З КІТАЙСКІМІ ВНУ

Засведчаныя дакументы накіраваны на пашырэнне міжнародных кантактаў у галіне адукацыі і навукі, умацаванне экспартнага патэнцыялу БДУ і развіццё эфектыўнага міжуніверсітэцкага ўзаемадзеяння дзвюх краін. **Першым афіцыйным дакументам** стаў мемарандум аб узаемаразуменні паміж БДУ і Сіцзянскім універсітэтам.

**Другі дакумент** падпісаны паміж БДУ і Кашыйскім універсітэтам. Дамоўленасці прадугледжваюць абмен студэнтамі, магістрантамі, выкладчыкамі для рэалізацыі навучальнага працэсу і ўдзелу ў сумесных навуковых і адукацыйных праектах. Акрамя таго, дакумент рэгулюе працэсы абмену інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі, сумесная праведзення навукова-адукацыйных мерапрыемстваў і падрыхтоўку публікацый, гасцявых лекцый, майстар-класаў, узаемны ўдзел студэнтаў у летніх і зімовых школах.

**Трэцім дакументам** стаў мемарандум аб узаемаразуменні з Яньшанскім універсітэтам. Гэта адзін з найлепшых універсітэтаў у свеце, створаны ў 1920 годзе на базе Харбінскага політэхнічнага інстытута. Студэнтамі ўніверсітэта з'яўляюцца каля 40000 кітайскіх і замежных грамадзян. Яны праходзяць навучанне па моўных праграмах, а таксама па тэхнічных спецыяльнасцях, лінгвістыцы, эканоміцы, кіраванні, праве і педагогіцы. Універсітэт вядомы даследаваннямі і распрацоўкамі ў галіне тэхнічных навук.

## СТРАТЭГІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ГАЛІНЕ АДУКАЦЫІ І МОЛАДЗЕВАЙ ПАЛІТЫКІ АБМЕРКАВАЛІ ПАДЧАС ВІЗІТУ ДЭЛЕГАЦЫІ БДУ Ў КІТАЙ

Праграма візіту ўключала мерапрыемствы па развіцці партнёрскіх адносін, папулярызацыю адукацыйна-навуковага патэнцыялу БДУ, культурных і духоўных каштоўнасцяў Беларусі сярод кітайскай моладзі.

Прадуктыўнай стала сустрэча рэктара Андрэя Караля з сакратаром партыйнага камітэта Яньшанскага ўніверсітэта Чжаа Сяньфэнам. Бакі абмеркавалі рэалізацыю сумесных праграм падрыхтоўкі кітайскіх грамадзян, узгаднілі план супрацоўніцтва ў рамках падпісанага ў маі бягучага года мемарандума аб паразуменні. Таксама былі дасягнуты дамоўленасці пра арганізацыю на базе Яньшанскага ўніверсітэта сумесна з Інстытутам інавацыйнай адукацыі БДУ ў г. Санья праграмы навучання рускай мове кітайскіх абітурыентаў для далейшага паступлення ў БДУ.

Значнай падзеяй стаў удзел дэлегацыі БДУ ў арганізаваным сумесна з Пекінскім універсітэтам беларуска-кітайскім фэсце «Зроблена ў Беларусі». Тут кітайскай моладзі прадставілі найлепшыя танцавальныя і музычныя кампазіцыі з культурна-фальклорнай спадчыны Беларусі.

Сёння Кітай з'яўляецца адным са стратэгічных партнёраў для БДУ. Пацвярджэннем таму стала станоўчая дынаміка за апошнія дзесяць гадоў павелічэння колькасці пагадненняў з гэтай краінай. Каля 20% ад агульнай колькасці ўсіх міжнародных дамоў БДУ складзены па кітайскім вектары. Усяго дзейнічае больш за 600 пагадненняў з арганізацыямі з 57 краін.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
18 чэрвеня 2025 года, №6 (2297)

# МІНСК – КУАЛА-ЛУМПУР: БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТКІ ПРА СВОЙ ДОСВЕД ВУЧОБЫ Ў МАЛАЙЗІІ





**Студэнткі журфака БДУ рызыкнулі пакінуць звыклы свет і адправіліся па веды ў іншы канец планеты – у сонечную Малайзію. Што іх чакала за тысячы кіламетраў ад дома? Новыя сябры, экзатычная культура і неацэнны вопыт, які змяніў іх жыццё. Сёння яны дзеляцца сваімі ўражаннямі, распавядаюць пра складанасці адаптацыі, пра ўсходнюю гасціннасць і пра тое, як вучоба ў Куала-Лумпуры адкрыла для іх новыя гарызонты.**

Ідэя змяніць на семестр краіну ўзнікла ў трэцякурсніцы Ксеніі Смірновай спантанна. Авантуру падтрымала яе аднагрупніца Надзея Апановіч, і дзяўчаты пачалі рыхтавацца да паездкі.

– *Калі ў нас з'явілася жаданне паспрабаваць вучыцца ў новай краіне, ва ўніверсітэце быў выбар толькі паміж Малайзіяй і Расіяй. Можна было паехаць у Маскву і ў Санкт-Пецярбург, але хацелася чагосьці новага, а Малайзія, відавочна, мацней адрозніваецца ад Беларусі,* – так аргументуе свой выбар Ксюша.

## СКЛАДАНАСЦІ З ПАДРЫХТОЎКАЙ

Пачатак падрыхтоўкі быў досыць простым. На праграмы абмену часта ёсць конкурс, але паехаць вучыцца ў Малайзію аказалася не так шмат ахвотнікаў, таму ніякага адбору праходзіць не прыйшлося.

На думку дзяўчат, самым складаным у арганізацыі паездкі быў збор дакументаў. Важна загадзя апавяшчаць адміністрацыю і факультэта, і ўніверсітэта. І хоць на вучобу ў іншую краіну яны адправіліся ў восеньскім семестры, збіраць усе дакументы пачалі яшчэ ў красавіку. Але нават гэта не выратавала студэнтак ад стрэсу.

– *Увесь працэс аказаўся даволі зацяжны, складаны, шмат у чым незразумелы. Таму важна вельмі старанна разбірацца ва ўсіх «папяровых справах»,* – дадае Надзя.

## НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС

На адзін семестр студэнткі змянілі БДУ на Universiti Malaya ў сталіцы Малайзіі Куала-Лумпуры. А факультэт журналістыкі – на факультэт мастацтваў і сацыяльных навук. Адукацыйная сістэма Беларусі і Малайзіі шмат у чым адрозніваецца. Так, у новай ВНУ дзяўчаты самі выбіралі сабе праграмы для вывучэння. Як адзначае Ксюша, выбар прадметаў – гэта гульня на хуткасць. На кожную дысцыпліну ёсць абмежаваная колькасць месцаў. На прадметы, блізкія да журналістыкі, месцы скончыліся вельмі хутка, таму Надзя і Ксюша дабіралі дысцыпліны да патрэбнай колькасці з шырокага пераліку, не звязанага з іх асноўнай праграмай навучання. У гэты спіс трапілі псіхалогія, міжкультурная камунікацыя, культура Азіі і навыкі пабудовы каманды.

– *Я вывучала ў асноўным антрапалагічныя дысцыпліны. Яны не вельмі пераклікаюцца з журналістыкай, але ў гэтай прафесіі важна быць рознабакова адукаваным і атрымліваць любыя веды,* – гаворыць Надзея.

А з-за таго, што прадметы, якія студэнткі вывучалі ў Беларусі і Куала-Лумпуры, не перасякаюцца, дзяўчаты па вяртанні ў Мінск здавалі ўсе прадметы на сесіі ў БДУ.

Уразіла стаўленне мясцовых студэнтаў да вучобы. У іх было ўсяго 5 прадметаў, а ў Беларусі ў тым жа семестры – 13. У Малайзіі ў людзей, якія там пастаянна вучацца, каля 8 прадметаў за семестр. Нягледзячы на тое, што навучэнцам трэба выканаць літаральна адно групавое заданне за паўгода, яны ставяцца да вучобы сур'ёзна.

– *Я пыталася ў сваіх новых сяброў, як праходзяць іх вакацыі, а яны адказвалі, што вучацца амаль заўсёды. І сапраўды, уся моладзь вельмі начытаная, адукаваная, з імі цікава весці размову,* – каментуе Ксенія.

## ВОЛЬНЫ ЧАС

Як адзначае Надзя Апановіч, штодзённае жыццё было вельмі спакойным: у тыдзень усяго 10 пар, вучоба займала тры дні, дамашнія заданні ў асноўным творчыя і дыстанцыйныя. Гэта ўцягвала ў навучальны працэс і давала шмат вольнага часу, каб падарожнічаць па краіне.

Акрамя таго, ва ўніверсітэце часта арганізоўвалі вечары для прагляду фільмаў, дзе можна было пазнаёміцца з равеснікамі.

– *Малайзія – гэта мультыкультурная краіна, тут адзначаюцца святы ўсіх рэлігій і канфесій, што дазваляе вывучаць культуру розных народаў. Мы трапілі на некалькі нацыянальных мерапрыемстваў, і было вельмі цікава за імі назіраць. Напрыклад, мы наведалі кітайскі Новы год і індыйскае свята Дыпавалі,* – адзначае Надзея.

А вось Ксеніі асабліва запомніліся экскурсіі ў суседнія гарады:

– *Вельмі спадабалася ружовая мячэць у горадзе Путраджая, гэта сапраўды ўнікальнае месца. Яшчэ ў Малайзіі мы ўпершыню апынуліся ля мора. Выдатна, што ўсе гэтыя паездкі і мерапрыемствы для студэнтаў арганізоўвае ўніверсітэт.*

## ПЫТАННІ АДАПТАЦЫІ І МОЎ

Як адзначаюць дзяўчаты, моўнага бар'ера як такога не было, бо ў краіне нароўні з малайзійскай афіцыйна замацавана англійская мова. Таму з кожным жыхаром можна свабодна гутарыць. Адзінай праблемай у зносінах сталі акцэнты. Самым складаным для разумення стала індускае маўленне. У першы час размаўляць са студэнтамі з Індыі было вельмі складана, але, як сказала Надзея, усё – справа звычкі, і нават да незвычайнага вымаўлення можна адаптавацца. Асноўная парада, якую нашы студэнткі могуць даць для паспяховай вучобы па абмене – пастаянна практыкаваць англійскую мову.

Асноўным адрозненнем у менталітэтах беларусаў і малайзійцаў стала адкрытасць. Наўрад ці можна сказаць, што беларусы вельмі закрытыя, але ў малайзійцаў дзіўны ўзровень адкрытасці.

– *Калі выйсці на вуліцу, табе прыкладна сто разоў скажуць «добрай раніцы» і кожны прахожы будзе ўсміхацца. Калі звернешся да кагосьці з просьбай, табе ніколі не адмовяць,* – дапаўняе Надзя.

Ксюша таксама адаптавалася да новай краіны досыць хутка і без сур'ёзных праблем.

– *Самым складаным у новым універсітэце стаў пошук патрэбных аўдыторый. На тэрыторыі кампуса знаходзяцца ўсе факультэты, і заблытацца ў будынках было вельмі проста.*

*Галоўная цяжкасць на працягу ўсіх 6 месяцаў – гэта ежа. Адсутнічаюць звыклыя для нас малочныя прадукты, а тыя, што ёсць, вельмі дарагія і моцна адрозніваюцца на смак. Я нават не думала, што так люблю тварожныя сыркі і смятану. Яшчэ там вельмі спецыфічная кухня, нязвыклая для нас. Нават калі ў кафэ папрасіць зрабіць страву не такой пякучай, яна ўсё роўна будзе занадта вострай.*

## УРАЖАННІ І ВЫСНОВЫ

Надзя вельмі ўдзячная сабе за тое, што не адступілася і змагла прайсці да канца ўвесь цяжкі шлях з дакументамі. Па словах студэнткі, вярнуўшыся ў Беларусь, яна ўжо вельмі сумуе па тым часе. Для яе гэта быў сапраўды іншы свет.

– *Наогул, да таго, як я падала заяўку, я нічога не ведала пра Малайзію, але цяпер я раю ўсім прыехаць туды хоць бы на адпачынак. А калі ёсць магчымасць паехаць вучыцца, то абавязкова едзьце, не думайце, не бойцеся, а рыхтуйцеся да яркіх уражанняў,* – падсумоўвае Ксюша Смірнова.

Вопыт Надзі і Ксюшы паказвае, што вучоба за мяжой – не толькі акадэмічныя веды, але і сапраўдныя прыгоды, напоўненыя адкрыццямі і знаёмствамі з іншымі культурамі. Малайзія стала для іх краінай адкрытых, добразычлівых людзей, дзе студэнты могуць не толькі вучыцца, але і творча развівацца, падарожнічаць і атрымліваць асалоду ад жыцця.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

# ФІНАНСЫ, ПРАКТЫКА І НАТХНЕННЕ: ГІСТОРЫЯ СТУДЭНТКІ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА МАРТЫ БАЛЬШАКОВАЙ



***«Я ўдзячная сабе за смеласць»,* – кажа Марта, успамінаючы пераезд у іншы горад і паступленне ў БДУ. Сёння яна адна з тых, хто бачыць у эканоміцы не сухія формулы, а гісторыі людзей, глабальныя трэнды і бясконцае поле для аналізу. Яе першы курс даказаў: любая справа – і банкаўская практыка ў тым ліку – можа натхняць, калі падыходзіць да яе з цікаўнасцю і жаданнем вучыцца.**

Марта Бальшакова вучыцца на эканамічным факультэце, на спецыяльнасці «фінансы і крэдыт». З будучай прафесіяй дзяўчына вызначылася задоўга да паступлення ў БДУ. З эканамічным профілем яна пазнаёмілася ў ліцэі №1 імя А. С. Пушкіна г. Брэста. Яшчэ школьніцай была ўпэўненая ў выбары месца вучобы, у асноўным з-за прафесійнай падрыхтоўкі да іспытаў, якія праходзілі ў ліцэі, і асаблівай любові да профільных прадметаў. Над выбарам спецыяльнасці думала нядоўга: Марта лічыць сваю самай карыснай і цікавай. Як адзначае студэнтка, з кожным новым месяцам навучання яна ўсё больш пераконваецца ў правільнасці выбару прафесіі.

Адначасова самым складаным і цікавым у эканоміцы для студэнткі стала перапляценне паводзін людзей з лічбамі і формуламі. Па словах дзяўчыны, эканоміка накшталт навукі пра рэсурсы, але на самай справе яна пра ўсё: ад эмоцый інвестараў да глабальных трансфармацый.

За першы курс навучання ў БДУ Марта паспела пазнаёміцца з прафесіяй ужывую. Вучэбна-азнаямленчую практыку яна праходзіла на базе ААТ «Белаграпрамбанк». Па словах нашай гераіні, там яна цалкам пагрузілася ў атмасферу дарослага жыцця і выконвала канкрэтныя задачы банкаўскага кансультанта. Прыемным бонусам была карпаратыўная культура. Прафесіяналы не ставяцца высакамерна з-за неспрактыкаванасці моладзі, а наадварот, вучаць і накіроўваюць. Гэта вельмі натхняе і дадае любові да прафесіі.

Акрамя таго, факультэт часта арганізоўвае сустрэчы з банкамі і фінансавымі арганізацыямі з ухілам на практыку. На такіх мерапрыемствах Марта прысутнічае заўсёды.

У банк адоранай моладзі наша гераіня трапіла, калі атрымала дыплом II ступені на міжнароднай алімпіядзе па рускай мове і літаратуры «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць» у 2023/2024 навучальным годзе.

З самага дзяцінства студэнтка аддавала перавагу дысцыплінам, звязаным з лагічным мысленнем, таму абрала профільныя прадметы, звязаныя не з завучваннем, а з паслядоўным даследаваннем, стварэннем прычынна-выніковых сувязяў. Па словах першакурсніцы, самы дзейсны спосаб вучыцца лепш – не «зубрыць», а разумець, разбірацца. У школе з дадзенай тэхнікай бывае складана, бо на ступені сярэдняй адукацыі многае трэба было запамінаць, аднак ва ўніверсітэце, асабліва на эканамічным факультэце, выкладчыкі імкнуцца навучыць думаць шырэй, разважаць пра праблемы за межамі канспекта або кнігі, разбірацца не толькі ў тэорыі, але і ў практыцы. Такі падыход дапамагае Марце траціць менш часу на вучобу і больш – на самаразвіццё. Дзяўчына не адчувае стомленасці, а атрымлівае натхненне і дадатковую матывацыю, калі займаецца тым, што спатрэбіцца ў будучыні або проста падабаецца.

Рухаючыся паэтапна, яна імкнецца атрымаць новыя якасныя навыкі і веды, а сваёй галоўнай мэтай лічыць паспяховае завяршэнне бакалаўрыяту. У дадзены момант навучэнка актыўна шукае свой шлях у эканоміцы, імкнецца не баяцца спрабаваць нешта новае і аналізуе змест дысцыплін, каб вызначыць уласную сферу інтарэсаў.

Час па-за эканамічным факультэтам першакурсніца прысвячае чытанню і актыўнаму адпачынку: любіць прагулкі, часта катаецца на веласіпедзе і роліках, плавае. Марта перакананая, што гэтыя заняткі даюць ёй эмацыйную разгрузку, неабходную для скарэння новых вяршыняў. У апошні час дзяўчына часта глядзіць інтэрв'ю вядомых людзей: навукоўцаў, акцёраў ці проста цікавых для яе блогераў. Гэта і з'яўляецца асноўнай крыніцай натхнення і новых ідэй.

Зараз Марта толькі пачынае свой шлях у эканоміцы, але ўжо ясна: яе зацятасць, аналітычны склад розуму і любоў да прафесіі дапамогуць ёй дасягнуць вялікіх вышынь. Наперадзе яшчэ тры гады вучобы, новыя практыкі, адкрыцці, велапрагулкі для натхнення. І, як кажа сама студэнтка, галоўнае не баяцца спрабаваць, і тады нават складаныя задачы ператвараюцца ў займальныя магчымасці.

# АД МАРЫ ДА МАЙСТЭРСТВА: ЯК АНАСТАСІЯ ГРАЧЫШКА СУМЯШЧАЕ ВУЧОБУ І ПРАФЕСІЙНЫ СПОРТ

**Выдатніца, спартсменка і проста прыгажуня. А яшчэ Анастасія Грачышка – прадстаўніца банка даных адоранай моладзі Беларусі. Дзяўчына распавяла, як сумяшчае вучобу, спорт і грамадскую дзейнасць.**

Паступаць у БДУ Анастасія вырашыла яшчэ задоўга да заканчэння школы. Ужо ў 7 класе дзяўчына паставіла сабе мэту стаць студэнткай БДУ, паколькі гэта вядучы ўніверсітэт краіны. З факультэтам і спецыяльнасцю вызначылася крыху пазней. У 9 класе яна перараканалася, што ахвотней цікавіцца матэматыкай і англійскай мовай – іх патрабуюць больш за ўсё пры паступленні на эканамічныя спецыяльнасці. Аднак для Насці вельмі важна было працягваць вывучэнне замежных моў і мець магчымасць пасля выпуску знайсці добрую працу.

Мэта Анастасіі была дасягнута – цяпер дзяўчына вучыцца на факультэце міжнародных адносін на спецыяльнасці «сусветная эканоміка». Паступленне атрымалася не без складанасцяў. Балы на спецыяльнасць заўсёды высокія.

*– Паступала я ў 2023 годзе з 386 баламі – гэтага было недастаткова на той момант для бюджэту. Таму доўга думала, ці варта наогул падаваць дакументы. З татам паехалі ў Мінск (сама я ўраджэнка Гродна) у апошні дзень падачы дакументаў. Тады я палічыла, што са сваімі баламі замкнула б дзясятку бюджэтнікаў. Табліца абнаўлялася з затрымкамі, і мы вырашылі паспрабаваць. Было настолькі хвалююча, што пры падачы дакументаў я заплакала прама перад дэканам – напэўна, гэта самы запамінальны момант. Было і сорамна, і няёмка адначасова,* – успамінае гераіня.

Універсітэт дорыць Анастасіі найлепшы студэнцкі час і дае шмат магчымасцяў для развіцця і ў навуковай, і ў спартыўнай сферах. Тут дзяўчына ўжо сустрэла многіх людзей, якія пакінулі і працягваюць пакідаць важныя адбіткі ў жыцці. Самыя запамінальныя дні, на думку Насці – першыя тыдні: калі ўсе студэнты толькі знаёміліся, шмат гулялі па Мінску. Зараз Анастасія практычна цалкам прысвячае сябе ўніверсітэту, але гэта не толькі пра вучобу. Дзяўчына знаходзіць час таксама і для грамадскай дзейнасці.

Шлях у вялікі спорт для Анастасіі Грачышка пачаўся задоўга да паступлення ва ўніверсітэт. У тры гады яна трапіла на мастацкую гімнастыку, на секцыю яе запісала мама. Ужо тады нашу гераіню заўважыла трэнер Наталля Аліева. Так і пачаўся перыяд спорту даўжынёй у 13 гадоў. Увесь гэты час Насця жыла мастацкай гімнастыкай, прысвячала ёй усе сілы. І ў выніку дзяўчына была ўдастоена звання майстра спорту Рэспублікі Беларусь па мастацкай гімнастыцы.

*– Цяпер я вельмі ўдзячная сабе за кожны выбар, але прафесійны спорт – гэта слёзы, траўмы, дыеты. За тры гады да атрымання майстра спорту хацелася ўсё кінуць і сысці, такія спробы былі. Вельмі шмат зрабіла мама, падтрымлівала і матывавала, каб я не кідала справу за крок да мэты.*

Званне майстра Анастасія атрымала ў 2021 годзе падчас пандэміі каранавіруса. Выязджаць на спаборніцтвы было нельга, таму шлях да тытула ўскладніўся. Але мерапрыемствы правялі ў анлайн-фармаце. Тады спартсменка стала сярэбраным прызёрам, выканаўшы разрад майстра спорту. На гэтым кар'ера ў мастацкай гімнастыцы скончылася – паўплывала стомленасць і змены прыярытэтаў. Аднак, як адзначае Насця, без спорту яна не адчувае сябе жывой, ёй бракуе сіл і энергіі, таму ўжо ў БДУ распачаўся этап аэробікі. Неўзабаве дзяўчына стала майстрам спорту і ў гэтым напрамку. У 2025 годзе яна разам з камандай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта перамагла ў агульнакамандным заліку Рэспубліканскай універсіяды 2024/2025, стаўшы абсалютным чэмпіёнам. Менавіта за гэта спаборніцтва Анастасія ўдастоена звання майстра спорту Рэспублікі Беларусь па аэробіцы танцавальнай.

*– Аэробіка – больш хобі. Напэўна, нейкая замена гімнастыкі, каб падтрымліваць сваю форму і гнуткасць. Спорт для душы, ён прыносіць мне асалоду, таму гэтым і займаюся. А калі нешта ў задавальненне, то і сумяшчаць з вучобай не цяжка, а наадварот – зараджае і напаўняе сіламі для плённай працы.*



Сваю будучую дзейнасць Анастасія плануе звязаць са спецыяльнасцю, на якой вучыцца. Але ёй пакуль што складана дакладна выбраць прафесію. Як адзначае студэнтка, хочацца паспрабаваць сябе ў розных напрамках. Напрыклад, яна плануе папрацаваць менеджарам па маркетынгу, які ўзаемадзейнічае з кліентамі і распрацоўвае маркетынгавыя стратэгіі. Прываблівае другакурсніцу і праца ў дзяржаўных органах, напрыклад, у Міністэрстве фінансаў.

*– Хочацца атрымліваць асалоду ад сваёй працы, быць карыснай людзям. Я лічу, што няма няправільных дзеянняў, бо кожнае з іх вядзе нас туды, дзе мы павінны быць, і гэта непазбежна. Таму, што б я сёння ні рабіла для дасягнення сваёй мэты – гэта правільны кірунак, бо дзякуючы ўсім маім дзеянням я тая, хто я ёсць.*

Для дзяўчыны важна вытрымліваць баланс паміж вучобай, хобі, сям'ёй, сябрамі і асабістым жыццём. Яна лічыць, што нельга цалкам накіроўваць усе сілы толькі на вучобу або зацыклівацца на чымсьці адным, таму што ў нашым жыцці шмат цікавага, незвычайнага, таго, што можа нас вучыць і забаўляць.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
18 чэрвеня 2025 года, №6 (2297)

# ДЫНАСТЫЯ МАЛЕВІЧ: 83 ГАДЫ З БДУ

**Дынастыю складаюць доктар палітычных навук, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесары, высокакваліфікаваныя педагогі, аўтары навуковых прац. Стаж дынастыі ў БДУ – 83 гады.**





Кафедра міжнародных адносін, Малевіч Ю.І. — у першым шэрагу, у цэнтры

**Малевіч Ігар Аляксандравіч** – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар (бацька Малевіч Ю. І.). Стаж працы ў БДУ – 55 гадоў.

Ігар Аляксандравіч нарадзіўся 13 лістапада 1941 г. у г. Мінску. Пасля заканчэння вучобы ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце паступіў у аспірантуру фізічнага факультэта БДУ. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «эксперыментальная фізіка». У 1982 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Часавыя метады аналізу светлавых патокаў, ініцыяваных лазерным выпраменьваннем, і іх выкарыстанне для стварэння лазерных вымяральных сістэм субнанасекунднага разрознення». У 1984 г. І. А. Малевічу было прысвоена званне доктара фізіка-матэматычных навук, у 1987 г. – званне прафесара.

Працаваў загадчыкам навуковай лабараторыі НДІ ПФП БДУ (1972–1982), загадчыкам кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ (1982–1996), дырэктарам створанага ім навуковага лазернага цэнтра БДУ(1990–1996) і намеснікам дырэктара цэнтра аэракасмічных даследаванняў прыродных рэсурсаў Зямлі БДУ (1994–1996).

І. А. Малевіч таксама ажыццяўляў актыўную выкладчыцкую дзейнасць за мяжой: у 1978 г. – прафесар Гарвардскага ўніверсітэта (Цэнтр астрафізікі, ЗША), у 1977–1978 гг. і 1993 г. – доктар-даследчык Смітсаніянскага інстытута НАСА (Х'юстан – Бостан, ЗША), з 1996 г. па 1997 г. – саветнік па навуцы Пасольства Беларусі ў КНР (Пекін); у 1997–1998 гг. – канцэпт-даследчык НАСА (Остын, Х'юстан – Тэхас), з 1997 г. па 2000 г. – кіраўнік дыпламатычнай місіі Беларусі ў Рэспубліцы Карэя (Сеул) і інш.

У 1991–2002 гг. уваходзіў у склад навуковага савета «Статыстычная фізіка» прэзідыума АН СССР. Арганізатар і навуковы кіраўнік міжнароднага кангрэса «Статыстычная радыёфізіка» (1981, 1985, 1990, 1992 гг.).

Ігар Аляксандравіч стварыў высокакваліфікаваную навуковую школу лазернай статыстычнай хронаскапіі. Пад яго кіраўніцтвам навучаліся 32 кандыдаты навук, 5 дактароў навук, больш за 15 дактароў філасофіі замежных універсітэтаў.

Навуковымі калектывамі І. А. Малевіча былі ажыццёўлены шэраг даследаванняў і распрацовак па мэтавых праграмах СССР і Рэспублікі Беларусь.

Ігар Аляксандравіч з'яўляецца аўтарам больш чым 100 вынаходстваў і патэнтаў, якія былі пакладзены ў аснову новых напрамкаў даследаванняў і распрацовак прыкладнога характару. Сярод іх метады лазернай лакацыі касмічных аб'ектаў і Месяца, спосабы выяўлення аб'ектаў штучнага паходжання ў атмасферы і акіяне, аптычны камп'ютар і аптычныя вылічальнікі, метады і сістэмы дыягностыкі навакольнага асяроддзя і інш. З'яўляецца аўтарам 13 манаграфій, звыш 300 навуковых публікацый.

За высокія дасягненні І. А. Малевіч быў адзначаны шэрагам узнагарод. У 1974 г. стаў лаўрэатам Прэміі ВЛКСМ па навуцы, у 1982 г. – Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі. У 1981 г. быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», у 1985 г. – медалём «Ветэран працы».



**Малевіч Юліяна Ігараўна** – доктар палітычных навук, прафесар (дачка Малевіча І. А.). Педагагічны стаж у БДУ – 28 гадоў.

Юліяна Ігараўна нарадзілася ў 1966 г. у Мінску. У 1988 г. стала выпускніцай гістарычнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і ў тым жа годзе паступіла ў аспірантуру на кафедру навуковага камунізму ў БДУ. З 1990 г. пачала выкладчыцкую дзейнасць. У 1994 г. скончыла аспірантуру пры БДУ па спецыяльнасці «паліталогія».

У 1995 г. паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прынцыпы канцэпцыі правоў чалавека ў замежнапалітычных канцэпцыях ЗША (1970–80-я гг.)».

У 1997 г. пачала працу на кафедры міжнародных адносін ФМА ў якасці старшага выкладчыка. З 2000 па 2003 г. навучалася ў дактарантуры БДУ. У сакавіку 2005 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Эвалюцыя канцэптуальных падыходаў да правоў чалавека ва ўмовах глабалізацыі» па спецыяльнасці «палітычныя праблемы міжнародных адносін і глабальнага развіцця».

У 2005 г. Ю. І. Малевіч было прысвоена званне доктара палітычных навук, у 2010 г. – званне прафесара.

У 2021 г. узначаліла кафедру міжнародных адносін аднайменнага факультэта.

Юліяна Ігараўна ажыццяўляе актыўную даследчую дзейнасць. З'яўляецца спецыялістам у галіне вывучэння асаблівасцяў палітычнага развіцця і замежнай палітыкі Кітая і краін Паўночна-Усходняй Азіі, у аналізе іх месца і ролі ў сусветнай палітыцы. Таксама ў сферу інтарэсаў навукоўца ўваходзіць даследаванне праблемы правоў чалавека ў сучасных міжнародных адносінах.

Прафесар Малевіч Ю. І. праходзіла навучанне і стажыравалася ў шэрагу замежных універсітэтаў у ЗША, КНР і інш. З'яўляецца прызнаным экспертам па праблемах унутранага і міжнароднага развіцця, часта выступае ў СМІ.

Юліяна Ігараўна вядзе актыўную дзейнасць у галіне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яе кіраўніцтвам навучаюцца беларускія аспіранты і грамадзяне Кітая, якія падрыхтавалі і абаранілі больш за 10 кандыдацкіх дысертацый па трох спецыяльнасцях і дзвюх галінах навуковых ведаў (паліталогія і гісторыя). На працягу 20 гадоў з'яўляецца членам савета па абароне дысертацый Д 02.01.18, а ў перыяд з 2015 па 2018 год была яго старшынёй.

Мае больш за 150 навуковых публікацый у айчынных і замежных выданнях, у тым ліку манаграфіі «Правы чалавека ў сусветнай палітыцы (другая палова XX стагоддзя)» (2001), «Правы чалавека ў глабальным свеце» (2004), «Інавацыйныя стратэгіі глабалізацыі» (2015).

За высокія дасягненні Юліяне Ігараўне ў 2007 г. была прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь як найлепшаму маладому навукоўцу. Заслужаны работнік БДУ, неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі Міністэрства адукацыі і БДУ, мае нагрудны знак «100 гадоў БДУ».

Працягвае дынастыю дачка Юліяны Ігараўны, унучка Ігара Аляксандравіча – Кацярына Ільінічна Малевіч, якая ў 2013 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

Дынастыя ўнесла вялікі ўклад у развіццё шэрагу галін навукі. Прадстаўнікі дынастыі ўслаўляюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт як высокакваліфікаваныя спецыялісты.

**Дар'я АРТАМОНАВА**

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

У Мінску пачаліся здымкі мастацкага фільма «Адно на дваіх», заснаванага на рэальных падзеях. Сюжэт расказвае пра маладых герояў Нікіту Куконенку і Андрэя Нічыпорчыка, якія цаной свайго жыцця выратавалі людзей, кіруючы Як-130. Яны пасмяротна атрымалі званне «Герой Беларусі» за свой подзвіг. Фільм выйдзе ў кінатэатрах 19 мая 2026 года, здымкі праходзяць таксама ў іншых гарадах краіны.

У «Вялікім камені» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве з Кітайскай асацыяцыяй цэнтраў развіцця прадукцыйнасці, накіраваны на развіццё біямедыцыны, машынабудавання і новых матэрыялаў. Бакі плануюць сумесна прыцягваць інвестыцыі і арганізоўваць міжнародныя мерапрыемствы для развіцця індустрыяльнага парка. Падчас перамоў абмяркоўваліся ўмовы інвестыцыйных праектаў, прэферэнцыі парка і перспектывы прамысловага супрацоўніцтва.

У 2025 годзе ў Беларусі адбудзецца першы масавы выпуск профільных інжынерных класаў, а гэта каля 2,5 тысяч школьнікаў. Выпускнікі з высокімі вынікамі змогуць паступаць на больш чым 70 спецыяльнасцяў без экзаменаў пры наяўнасці рэкамендацый педагогаў. Такія профільныя класы ўжо існуюць для педагагічных і аграрных напрамкаў і паказваюць станоўчыя вынікі.

У 2025 годзе Беларусь прадставіць у ААН два нацыянальныя даклады: трэці добраахвотны агляд па ўстойлівым развіцці і даклад да чацвёртага цыкла ўніверсальнага перыядычнага агляду па правах чалавека. Падрыхтоўка дакладаў абмяркоўвалася на пасяджэнні Савета па ўстойлівым развіцці з удзелам прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, парламента, грамадскасці і міжнародных экспертаў. Выніковыя матэрыялы будуць прадстаўлены на Палітычным форуме высокага ўзроўню ў Нью-Ёрку ў ліпені і на сесіі Савета па правах чалавека ў Жэневе ў лістападзе 2025 года.

У Беларусі плануюць укараніць элементы штучнага інтэлекту для аналізу і апрацоўкі зваротаў грамадзян, каб палепшыць працу адзінай аўтаматызаванай сістэмы. За два з паловай гады ў сістэму паступіла каля 450 тысяч зваротаў, пры гэтым 20% скаргаў звязаны з ЖКГ, што патрабуе асаблівай увагі. Улады імкнуцца знізіць колькасць скаргаў і вырашаць праблемы на мясцовым узроўні з актыўным удзелам грамадзян і мясцовых Саветаў.

# УНІВЕРСІТЭТ – ГЭТА ЛЮДЗІ



**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў месцам сустрэчы не проста калег, а сапраўдных дынастый – сем'яў, чые імёны на працягу дзесяцігоддзяў непарыўна звязаны з гісторыяй і развіццём ВНУ. Дзень быў прысвечаны рэалізацыі праекта «З пакалення ў пакаленне. Дынастыі БДУ», закліканага захаваць і ўвекавечыць памяць пра тых, хто прысвяціў сваё жыццё служэнню навуцы і адукацыі.**

Праект стаў вынікам сумеснай і бесперапыннай архіўнай працы па зборы матэрыялаў пра выдатных дзеячаў універсітэта. На мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі дынастый, а таксама адміністрацыя БДУ.



Уражаннямі і сваім шляхам да ўзбагачэння гісторыі нашай ВНУ падзялілася прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце **Ганна Бакун**:

*– Я рада прысутнічаць на ўрачыстасці, дзе мы ўшаноўваем тых людзей, якія аддалі сваё жыццё, сваю энергію і свае кампетэнцыі БДУ, якому служылі цэлымі пакаленнямі. Гэта сапраўды вельмі дорага, таму што ў зменлівым свеце важна быць верным таму пакліканню і таму месцу працы, якое ты аднойчы выбраў. Ад імя ўніверсітэта я хачу вам падзякаваць за вернасць сваёй справе, за той уклад, які кожны з вас на працягу многіх дзесяцігоддзяў, вашы сем'і, вашы дынастыі рабілі для БДУ.*



На сустрэчы прысутнічаў і загадчык музея БДУ **Дзмітрый Сцяпанаў**. Ён не толькі дапамог увасобіць ідэі ў рэальнасць, але і сам стаў аўтарам некалькіх матэрыялаў:

*– Музей гісторыі БДУ рады быць часткай праекта. Кожная дынастыя ўнесла вялікі ўклад у развіццё навукі і БДУ. Важна і далей захоўваць пераемнасць паміж пакаленнямі, перадаваць назапашаны вопыт і мудрасць,* – дзеліцца Дзмітрый Сцяпанаў.

Канцэпцыя праекта заключалася ў стварэнні серыі ўнікальных артыкулаў пра радаводы БДУ ў фармаце інтэрв'ю, хронік, успамінаў і гістарычных звестак. Матэрыялы ўтрымлівалі інфармацыю пра прафесійныя дасягненні, агульны педагагічны стаж, навуковыя даследаванні дынастый выкладчыкаў і прынцыпы выкладання, індывідуальна выпрацаваныя за гады працы ва ўніверсітэце, што можна перадаць наступным пакаленням.

Сярэдні педагагічны стаж гэтых радаводаў у БДУ складае каля 100 гадоў. За гэты час прадстаўнікі сем'яў паспелі абараніць навуковыя дысертацыі, выхаваць і падрыхтаваць цэлы шэраг кандыдатаў і дактароў навук, а таксама зрабіць значны ўклад у развіццё адукацыйнай сістэмы ВНУ.

## ПРЫКЛАДЫ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ, АДДАНАСЦІ І ЛЮБОВІ ДА СВАЁЙ СПРАВЫ



Пра тое, як узнікла ідэя праекта, расказала **Дар'я Артамонава**, адна з аўтараў артыкулаў пра дынастыі:

*– Падчас фарміравання плана працы музея на 2024/2025 г. прарэктар Ганна Бакун прапанавала стварыць праект, прысвечаны дынастыям БДУ. Гэта ідэя была нам вельмі блізкая, бо і раней музей гісторыі БДУ збіраў звесткі пра працоўныя дынастыі ўніверсітэта. У 2016 г. нават выйшла ў друк кніга «Лёсам звязаны з БДУ». Сямейныя дынастыі БДУ – гэта прыклады прафесіяналізму, любові да сваёй справы. Яны з пакалення ў пакаленне перадаюць каштоўныя веды і вопыт сваіх сем'яў, чым спрыяюць папулярызацыі ўніверсітэта.*

Падчас рэалізацыі праекта была сабрана інфармацыя пра 15 дынастый, якія бесперапынна аддаюць сябе навуцы і дзеляцца сваімі ведамі са студэнтамі. Гэта не проста імёны ў спісах супрацоўнікаў і выпускнікоў – гэта жывая гісторыя, адданасць і працавітасць. Іх уклад у развіццё беларускай навукі і адукацыі неацэнны, а іх жыццёвы шлях – годны ўзор для пераймання.

## З БДУ НАЗАЎЖДЫ

Гэты дзень стаў магчымасцю не толькі расказаць пра прафесійныя дасягненні выдатных дзеячаў, але і падзяліцца сакральнымі ўспамінамі, перадаць атмасферу пераемнасці і важнасці захавання традыцый. Многія прызнаваліся, што менавіта ў сценах БДУ адчулі сябе часткай чагосьці большага, падтрымку і натхненне ад сваіх папярэднікаў:



*– Універсітэт заўсёды быў кузняй кадраў усёй краіны. Нашы спецыялісты – і фізікі, і матэматыкі, і эканамісты, і юрысты – заўсёды былі нарасхват. Я быў з БДУ не заўсёды. Але вярнуўся ў БДУ. А калі навука – твая ўлюбёная справа, ты ўжо ад яе ніколі не сыдзеш. Універсітэт заўсёды настройваў займацца навукай. І дынастыя, напэўна, не проста адміністратыўна, а менавіта праз навуку склалася. Трэба больш надаваць увагі абмену вопытам, навуцы, зносінам. Бо галоўнае, каб вы адчувалі самаразвіццё, каб былі як дома. І тады нашы ўнукі і дзеці працягнуць вучобу ва ўніверсітэце і створаць новыя дынастыі. Яшчэ раз вялікі дзякуй, што сабралі нас разам, каб ушанаваць нашых продкаў і нагадаць, як важна быць адданым аднаму роднаму месцу,* – расказаў **Леанід Давыдзенка**, прафесар кафедры міжнароднага турызму БДУ.



*– Хацела б выказаць шчырую і простую падзяку нашаму прафкаму, рэктарату і музею гісторыі БДУ, якія пачалі гэты праект, і я спадзяюся, што ён не скончыцца на нас. Гэта толькі пачатак вялікай гісторыі,* – дзеліцца **Галіна Круглова**, прафесар кафедры паліталогіі.

Захаванне гісторыі дынастый БДУ – гэта не проста даніна павагі мінуламу, але і інвестыцыя ў будучыню. Гэта дэманстрацыя таго, што веды, вопыт і любоў да сваёй справы могуць перадавацца з пакалення ў пакаленне, фарміруючы моцны падмурак для развіцця навукі і адукацыі ў Беларусі. Гэты дзень яшчэ раз пацвердзіў, што менавіта ў пераемнасці пакаленняў крыецца сіла і непаўторны дух Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
18 чэрвеня 2025 года, №6 (2297)

# ЮБІЛЕЙ ЗАСЛУЖАНАГА АМАТАРСКАГА КАЛЕКТЫВУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ – НАРОДНАГА АНСАМБЛЯ ТАНЦА «КРЫЖАЧОК» БДУ: 80 ГАДОЎ НА СЦЭНЕ І Ў СЭРЦЫ БЕЛАРУСІ



**Сёлета заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь – ансамбль танца «Крыжачок» БДУ адзначыў важную дату – 80-годдзе з дня заснавання. Сёння «Крыжачок» з'яўляецца адным з культурных брэндаў Рэспублікі Беларусь. За ўсе гады ён прайшоў доўгі і яркі шлях, аб'ехаў увесь свет і стаў неад'емнай часткай культурнага жыцця краіны. А пра тое, як прайшоў гэты важны дзень і чаму столькі танцораў выбіраюць менавіта «Крыжачок», чытайце ў нашым матэрыяле.**

## ГІСТОРЫЯ, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ ПАКАЛЕННІ

Ансамбль танца «Крыжачок» з'яўляецца аматарскім калектывам упраўлення па справах культуры БДУ, і яго гісторыя непарыўна звязана з гісторыяй нашага ўніверсітэта.

Студэнцкі танцавальны калектыў БДУ імя У. І. Леніна быў створаны ў 1945 годзе, адразу пасля Другой сусветнай вайны. Гэта стала для краіны сімвалам адраджэння і надзеі. Спачатку ў склад уваходзілі толькі студэнты і супрацоўнікі БДУ, пазней далучыліся прадстаўнікі іншых беларускіх ВНУ. Першы кіраўнік – Ларыса Алексютовіч. Да 1955 года ў рэпертуары было больш за 70 танцаў розных народаў СССР і свету. Калектыў актыўна ўдзельнічаў у мастацкіх фестывалях і атрымаў шмат узнагарод.

З 1964 года на базе ансамбля працавала аддзяленне харэаграфіі факультэта грамадскіх прафесій, якое рыхтавала кіраўнікоў танцавальных калектываў. Ён выступаў на многіх фестывалях і перад рознымі аўдыторыямі па ўсім СССР.

У 1967 годзе «Крыжачок» узначаліў заслужаны работнік культуры БССР Мікалай Лапша, які натхняў моладзь на вывучэнне народнай творчасці і беларускага танца. Патрабаванні да ўдзельнікаў былі высокія – і ў вучобе, і ў творчасці. Толькі сапраўдныя аматары народнага мастацтва заставаліся ў ансамблі і пасля заканчэння ўніверсітэта.



У 1968 годзе ансамбль «Крыжачок» атрымаў Ганаровую грамату Міністэрства адукацыі Літоўскай ССР за ўдзел у міжрэспубліканскім конкурсе «Гаўдэамус» у Вільнюсе. У 1969 годзе калектыў выступаў у ГДР з канцэртамі ў Берліне і іншых гарадах, дзе выступленні мелі вялікі поспех. Мастацкі кіраўнік Мікалай Лапша быў узнагароджаны ганаровым медалём Саюза свабоднай нямецкай моладзі. У 1971 годзе ансамбль зноў быў адзначаны граматай Міністэрства адукацыі БССР за ўдзел у конкурсе «Гаўдэамус» у Рызе. Па запрашэнні камітэта камсамола Сафійскага ўніверсітэта ансамбль наведаў Балгарыю, дзе даваў канцэрты ў Народнай оперы Сафіі і іншых месцах.

«Крыжачок» прадстаўляў беларускую культуру на розных сцэнах СССР: у Маскве, Ерэване, Рызе, Ташкенце, Кіеве, Ленінградзе і інш. Падчас Дзён культуры СССР у Ісландыі ў 1987 годзе калектыў быў прыняты Прэзідэнтам краіны і знакамітымі дзеячамі.

У 1987 годзе ансамбль выступаў у Чарнобыльскай зоне і атрымаў ганаровае званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Калектыў з'яўляецца лаўрэатам многіх міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў, уключаючы Сусветны фэст моладзі ў Маскве, «Музычную Еўропу – 93» і «Плоўдзіў – 95».

У 2006 годзе ансамбль удзельнічаў у Міжнародным фэсце танца на Паўночным Кіпры (CIOFF), у 2007 – у Міжнародным фальклорным фэсце ў Бернеме (Бельгія), а ў 2008 – у Міжнародным фэсце ў Стамбуле, дзе саліст атрымаў прыз у намінацыі «Найлепшы танцор».

За значны ўклад у папулярызацыю беларускага нацыянальнага мастацтва за мяжой у 2006 годзе ансамбль быў адзначаны ганаровай граматай Саюза таварыстваў дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі.

На працягу сваёй гісторыі «Крыжачок» браў удзел ва ўсіх важных універсітэцкіх мерапрыемствах, рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях, актыўна развіваў культурнае жыццё краіны і прадстаўляў БДУ і Беларусь на міжнароднай арэне, дзе неаднаразова атрымаў дыпломы і граматы.

Рэпертуар ансамбля вельмі разнастайны: у ім ёсць танцы з усяго свету – карэйскія, венесуэльскія, нямецкія, венгерскія і г. д. І на юбілейным канцэрце гэта было ярка прадэманстравана – яркія пінжакі, маракасы і вясёлая падача венесуэльскага танца «Харопа».

Важнай часткай праграмы застаюцца беларускія і рускія народныя танцы. Усе нумары выконваюцца пад жывую музыку, што надае выступленням асаблівую аўтэнтычнасць і эмацыйную насычанасць.

Увосень 1969 года напярэдадні 50-годдзя БССР і КПБ у сувязі з творчымі поспехамі, за плённую працу па эстэтычным выхаванні студэнцкай моладзі танцавальным ансамблю БДУ імя У. І. Леніна было прысвоена ганаровае званне «Народны ансамбль танца» (пастанова прэзідыума Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў).



У 2011 годзе па рашэнні спецыяльнай камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ансамблю танца «Крыжачок» было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». У 2021 годзе ансамбль становіцца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за значны ўклад у захаванне традыцый харэаграфічнага мастацтва і актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны.

З 2007 года кіраўніком і балетмайстрам заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля танца «Крыжачок» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з'яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Ігар Музалеўскі.

## АТМАСФЕРА ЛЮБОВІ І СЯБРОЎСТВА

У дзень канцэрта ў грымёрцы была заўважная ажыўленая мітусня. Дзяўчаты і хлопцы спяшаліся дапамагчы адно аднаму ў падрыхтоўцы – хтосьці акуратна завязваў гарсэты, хтосьці папраўляў сукенкі. Перад пачаткам выступлення музычны ансамбль разыгрываў інструменты, дадаючы ноткі лёгкага хвалявання і чакання. Гучанне скрыпкі на фоне беларускага арнаменту на сукенках дзяўчат прымушала паглыбіцца ў казку яшчэ да пачатку.

Калі ўсё было гатова, зала напоўнілася гледачамі – свабодных месцаў не засталося. Кожны нумар быў сапраўдным творам мастацтва: выкарыстоўваліся сучасныя, але ў той жа час традыцыйныя касцюмы, што надавала выступленням асаблівую прыгажосць. У адным з нумароў нават гучалі маракасы, што дапоўніла праграму яркімі фарбамі і дынамікай.





## ПАМЯТАЕМ, ДЛЯ ЧАГО МЫ ГЭТА РОБІМ

Лёсам «Крыжачку» было наканавана з'явіцца ў пераможным 1945 годзе – калі Беларусь і ўвесь народ перажылі выпрабаванні вайны і здабылі доўгачаканую свабоду. Ансамбль стаў іскрай надзеі, якая павінна была заззяць у сэрцах людзей пасля цяжкіх гадоў барацьбы і пакут.

Створаны з мэтай падняць дух народа і асвятліць пасляваенны час, «Крыжачок» з самага пачатку быў не проста харэаграфічным калектывам. Ён стаў напамінам пра тое, што нават у самыя цяжкія часы чалавек шукае радасць, прыгажосць і веру ў лепшае. І калі б не Вялікая Перамога, не было б і гэтага калектыву, які сёння з'яўляецца сімвалам нацыянальнай культуры і мастацкай спадчыны. Таму важнай часткай на юбілейным канцэрце была харэаграфічная сюіта «У гарадскім садзе», якая з дапамогай танца расказвала пра ганаровую перамогу нашых салдат. Эмацыйна, моцна і ярка танцоры перадалі атмасферу таго часу.

## ГОНАР ЗА ТРАДЫЦЫІ І БУДУЧЫНЮ: ГІСТОРЫІ ТАНЦОРАЎ

Калі «Крыжачок» толькі пачынаў свой творчы шлях, яго складалі пераважна студэнты БДУ – маладыя, поўныя энтузіязму і любові да танца. З часам калектыў вырас – прыйшлі новыя ўдзельнікі. Цяпер гэта ўжо больш дарослыя людзі, многія з якіх сталі бацькамі. Яны займаюць высокія пасады – інжынерыпраграмісты, вядучыя эканамісты, дырэктары, сузаснавальнікі паспяховых праектаў і кампаній. А хтосьці перайшоў у калектыў «Крыжачка» яшчэ ў школе. Нягледзячы на розныя шляхі і жыццёвыя абставіны, іх усіх аб'ядноўвае адно – запал і любоў да танца.

## ЯЎГЕНІЙ ВАЛАХАНОВІЧ, СТУДЭНТ БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ:

*– У «Крыжачку» я танцую ўжо сёмы год. У калектыў трапіў задоўга да паступлення ў БДУ. Усё дзякуючы маім бацькам, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі аркестра і прапрацавалі ў калектыве больш за 15 гадоў. Я хадзіў на канцэрты ансамбля з самага дзяцінства, мне вельмі падабалася, мабыць, таму я і трапіў у танцы.*

*Спачатку я хадзіў на бальныя танцы, але там не склалася. Потым – на сучасныя, дзе таксама чагосьці не хапала. І калі наш гурток сучасных танцаў распаўся, мой тата дамовіўся з Ігарам Юр'евічам (мастацкі кіраўнік. – Заўв. аўт.), каб даць мне магчымасць праявіць сябе і далучыцца да «Крыжачка». І тады я зразумеў, што гэта маё месца, а народны танец мяне падыходзіць больш за ўсё!*

*Падчас канцэрта я ў асноўным перажываў, ці хопіць сілы да канца. Аднак падчас першых нумароў я адчуў гонар за тое, што мы – «Крыжачок», што мы танцуем пад прыгожую музыку нашага аркестра. Мне было прыемна ўсведамляць сябе часткай згуртаванай каманды.*

*На фінальных нумарах эмоцыі зашкальвалі. Я цалкам адышоў ад думак пра вытрымку і змог сапраўды атрымліваць асалоду ад працэсу, адчуць вобраз і перадаць яго ў адпаведнасці з тэматыкай нумара!*



## КАЦЯРЫНА СТРАЛЬЦОВА, СТУДЭНТКА БНТУ:

*– Я трапіла ў «Крыжачок» два гады таму. Танцую ўжо каля 12 гадоў. З дзяцінства я займалася ў розных калектывах. Пра «Крыжачок» я даведалася з сацыяльных сетак, можна сказаць, выпадкова. Пасля пераезду з Бабруйска ў Мінск планавала сюды прыйсці – і так і зрабіла. Як кажа наш кіраўнік, трапіць да нас вельмі лёгка, а вось утрымацца – складана. Таму ў нас няма кастынгаў, проста прыходзьце, паглядзіце, як усё арганізавана, і вырашыце, ці патрэбна вам гэта. Безумоўна, кіраўнік іграе важную ролю, калі не ключавую. У нас ён цудоўны. Усе артысты – альбо прафесіяналы, альбо імкнуцца да гэтага. Атмасфера ў нас заўсёды прыемная, на рэпетыцыях і канцэртах – добразычлівая.*

*Лічу, што народныя танцы ніколі не выйдуць з моды. І ні адзін іншы стыль танцаў не выклікае ў мяне такіх эмоцый. Я ўпэўненая, што для тых, хто хоча займацца танцамі, гэта выдатная магчымасць. Не бойцеся, прыходзьце, вы ўсё адчуеце, пачуеце нашу музыку – у нас свой аркестр. Вас хутка зацягне, і страхі сыдуць. Галоўнае – шмат працаваць і не баяцца спрабаваць!*

## ПАВЕЛ ГУЗМАН, СТУДЭНТ МДЭІ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ:

*– Я танцую з 6 гадоў, а ў калектыве ўжо другі год. Трапіў сюды дзякуючы цеснай сувязі майго дзіцячага калектыву са Слуцка і «Крыжачка». Атмасфера на выступленні была натхняльнай. Як звычайна, перад выхадам я чуў сваю музыку, сэрца білася часта, унутры ўсё заціхала – і вось момант выхаду. Кіраўнік калектыву, Ігар Юр'евіч, верыў у нас, як заўсёды, і абавязкова падтрымліваў перад выступленнем. Маральна было досыць лёгка падрыхтавацца, бо ўсё было прапраблена з высокай дакладнасцю. Што было сапраўды незвычайна – адчуванне 80-гадовага юбілею калектыву. Успаміналіся тыя часы, калі на такіх жа святах танцавалі студэнты і аматары... Але ўсіх нас аб'ядноўвае адно: мы любім танцаваць і паказваць народныя танцы.*

Для кожнага ўдзельніка «Крыжачка» калектыў не проста месца для рэпетыцый і выступленняў. Гэта сям'я, дзе цэніцца дружба, падтрымка і агульнае захапленне. І для многіх менавіта ўдзел у калектыве стаў дэбютам на сцэне і ў творчасці. Асабліва кранальная гісторыя тых, для каго юбілей стаў асаблівым святам – першым выступленнем, якое застаецца ў сэрцах як важны і значны момант жыцця.

## АСОЛЬ ЯНУШКЕВІЧ, СТУДЭНТКА ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ:

*– Я прыйшла ў ансамбль «Крыжачок» адносна нядаўна, каля года таму. А танцамі займаюся ўжо 13 гадоў. У асноўным у мяне вопыт у народных танцах, таму выбар на карысць «Крыжачка» быў абсалютна свядомым. Гэта мой першы год у калектыве і мой першы канцэрт. З самага пачатку «Крыжачок» стаў для мяне не проста калектывам, а сапраўднай сям'ёй. Я адразу адчула цёплае стаўленне дзяўчат і хлопцаў. Усе адно аднаго пастаянна падтрымліваюць і дапамагаюць, ні ў чым не адмовяць.*

*Для тых, хто займаецца ў «Крыжачку» ўжо не першы год, гэты справаздачны канцэрт не проста магчымасць паказаць свае навыкі, а асаблівы момант, калі яны могуць выказаць усю душу калектыву, якую мы захоўваем і перадаём праз гады.*

## МАРЫЯ РАКОЦЬ, СТУДЭНТКА МДЛУ:

*– Родам я з Брэста. У «Крыжачку» я ўдзельнічаю з верасня 2024 года, амаль цэлы навучальны год. Мая гісторыя, як я трапіла ў калектыў, досыць цікавая, бо я была падпісана на гурт у Instagram два гады. Я скончыла харэаграфічную школу ў Брэсце. Пра тое, каб трапіць у гэты гурт пры БДУ, я нават не марыла. Мне вельмі падабаліся іх выступленні, я проста сачыла за імі. А калі я пераехала ў Мінск, даведалася пра кастынг. У мяне адразу ўзнікла ідэя пайсці. Увесь верасень я сумнявалася, але ў выніку наважылася. Ты прыходзіш на кастынг і займаешся разам з калектывам. Падчас рэпетыцыі кіраўнік сочыць за табой, а ў канцы кажа, падыходзіш ты ці не. Звычайна ўсё праходзіць добра. Мяне прынялі, я была проста на сёмым небе ад шчасця! Калектыў, як я і чакала, вельмі сяброўскі, усе падтрымліваюць і дапамагаюць адно аднаму. Гэта сапраўды згуртаваная каманда, і ўсе вельмі класныя. Я ганаруся тым, што змагла трапіць туды. Сённяшні канцэрт – маё першае вялікае выступленне ў калектыве. Хаця я пакуль не ўдзельнічаю ў многіх нумарах, я вельмі рада за іншых і за тое, што яны робяць.*

## ГОНАР КРАІНЫ

Для многіх удзельнікаў «Крыжачка» гэта не толькі творчая дзейнасць, але і магчымасць захаваць і развіваць багатую культурную спадчыну Беларусі, робячы гэта з любоўю і адказнасцю. Калектыў працягвае радаваць гледачоў сваімі выступленнямі і ўносіць значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
18 чэрвеня 2025 года, №6 (2297)

# КОЖНЫ ДЗЕНЬ З ВЕЛАСІПЕДАМ

***Штогод 3 чэрвеня адзначаецца Сусветны дзень веласіпеда, які быў абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН у красавіку 2018 года. У рамках праекта «Здароўе студэнта – 2025», які рэалізуе кандыдат медыцынскіх навук дацэнт БДУ Таццяна Дзюбкова-Жарнасек, мы пазнаёмім вас з чалавекам, для якога веласіпед – гэта не толькі сродак перасоўвання, але і інструмент кіравання здароўем, самаадчуваннем і настроем.***

**Яна Гарбунова** – студэнтка 3 курса факультэта міжнародных адносін БДУ, спецыяльнасці «міжнароднае права». Незалежна ад пары года і сюрпрызаў надвор'я гэтая мэтанакіраваная дзяўчына ўжо не першы год кожны дзень, каб дабрацца да ўніверсітэта, выбірае веласіпед – экалагічна чысты транспартны сродак. Веласіпед даўно стаў для Яны неад'емнай часткай жыцця. Сваім прыкладам яна даказвае, што ён можа быць надзейным спадарожнікам у паўсядзённых справах.

***– Яна, чаму ты абрала менавіта веласіпед?***

Па-першае, гэта эканомія грошай, бо я не буду марнаваць іх на праезд у грамадскім транспарце на працягу амаль усяго года. Па-другое, гэта клопат пра здароўе. Язда на веласіпедзе – выдатная кардыятрэніроўка. Я заўважыла, што кожны дзень на веласіпедзе ў любое надвор'е ўмацоўвае маю сардэчна-сасудзістую і дыхальную сістэмы, павялічвае агульны тонус арганізма, паляпшае настрой і стрэсаўстойлівасць. Па-трэцяе, гэта, несумненна, экалагічны аспект: я лічу, што кожны з нас павінен уносіць свой пасільны ўклад у ахову навакольнага асяроддзя, скарачэнне эмісіі парніковых газаў і памяншэнне выкідаў у атмасферу іншых забруджвальных рэчываў.

***– Што ты робіш, калі на вуліцы дрэннае надвор'е?***

Калі ідзе моцны дождж, то я еду грамадскім транспартам. Але ў выпадку, калі надвор'е прымальнае, напрыклад, невялікі дождж ці вецер, я ўсё адно еду на веласіпедзе. Такія ўмовы надвор'я – гэта не нагода адступаць, а толькі невялікае выпрабаванне, якое робіць язду на веласіпедзе яшчэ больш захапляльнай. Я павінна адзначыць, што веласіпед у любое надвор'е патрабуе пэўнага майстэрства і падрыхтоўкі.



***– Ці ёсць для цябе розніца паміж веласіпедам і электрасамакатам? Калі б у цябе быў выбар, чаму ты аддала б перавагу?***

Для мяне важнейшы веласіпед, чым электрасамакат, таму што на апошнім карыстальнік проста стаіць і едзе. Гэты сродак персанальнай мабільнасці, безумоўна, зручны і хуткі, але карыстанне ім не патрабуе ніякіх высілкаў. Мы, студэнты, і так цэлы дзень праводзім, седзячы ў аўдыторыях універсітэта, потым прыходзім дахаты, рыхтуемся да заняткаў і зноў сядзім, асабліва ў перыяд напісання курсавых прац ці сесіі. Сучасныя людзі мала рухаюцца, гэта адмоўна адлюстроўваецца на іх здароўі. Калі б у мяне быў выбар, я ўсё-такі абрала б веласіпед, таму што гэта выдатная магчымасць кампенсаваць недахоп руху і падтрымліваць сваё цела ў аптымальнай фізічнай форме. Ён умацоўвае цягліцы ніжніх канечнасцяў, павялічвае цягавітасць арганізма і пераноснасць не толькі цяжкіх фізічных нагрузак, але і разумовых. На маю думку, гэты працэс – і фізічная актыўнасць, і выдатны спосаб зняць стрэс, а таксама адцягнуць увагу ад шматлікіх праблем. Падчас язды на веласіпедзе мой мозг пераключаецца на рашэнне іншых задач. Гэта дазваляе мне расслабіцца, аднавіць свае сілы, а затым вярнуцца да спраў з новымі ідэямі, энтузіязмам і запасам энергіі.

***– Што ты можаш сказаць пра час, які затрачваецца на шлях да ўніверсітэта?***

У гэтым плане веласіпед нічым не саступае грамадскаму транспарту. Часу сыходзіць столькі ж, колькі і на аўтобусе, у сувязі з чым было б неразумна аддаць перавагу грамадскаму транспарту. Сваім стылем жыцця я выкрываю міф пра тое, што язда на веласіпедзе – гэта павольны і нязручны спосаб перасоўвання. Ва ўмовах такога буйнога горада, як Мінск, з яго шматлікімі транспартнымі заторамі і перапоўненым грамадскім транспартам веласіпед можа быць значна хутчэйшым і больш зручным варыянтам.

Багаты досвед язды на веласіпедзе студэнткі факультэта міжнародных адносін Яны Гарбуновай – натхняльны прыклад для тых, хто жадае ці хоць бы задумваецца пра тое, каб сесці на веласіпед, адмовіўшыся ад перапоўненых душных салонаў грамадскага транспарту ці персанальнага аўтамабіля з рухавіком унутранага згарання, які сваімі выкідамі ў атмасферу губіць нашу планету і здароўе кожнага з нас. Будзьце больш адважнымі, прымайце рашэнне хутчэй!

Гісторыя Яны – пра мэтанакіраванасць, сілу волі і ўсвядомлены выбар студэнткі на карысць экалагічна чыстага транспарту – веласіпеда. Ён можа быць не толькі зручным сродкам перасоўвання і арганізацыі вольнага часу, але і сімвалам будучых жыццёвых змен. Гледзячы на Яну – энергічную ўсмешлівую дзяўчыну ў выдатнай фізічнай форме – разумееш, што два колы вязуць у лепшую будучыню, напоўненую здароўем, свабодай адчуванняў і клопатам пра навакольнае асяроддзе.

**Дар'я ЯШЧАНКА**

## Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць вучонай ступені доктара або кандыдата навук, навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, работа якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [2] Вышэйшая адукацыя, наяўнасць вучонай ступені доктара або кандыдата навук, навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, работа якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [5] На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, работа якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў |
| **Старшы выкладчык** | [4] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць вучонай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш як 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі адукацыі», або «Спецыялісты»; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць вучонай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш як 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж работы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі адукацыі», або «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Механіка-матэматычны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 1 год |
| Прафесар кафедры інтэлектуальных метадаў мадэлявання | 4 гады |
| Прафесар кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання | 1 год |
| Дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэорыі функцый | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
пр. Незалежнасці, 4, каб 207; да 17 ліпеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
пр. Незалежнасці, 4, каб. 207; да 16 жніўня.

**Факультэт сацыякультурных камунікацый аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій [2] | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі [3] | 1 год |
| Прафесар кафедры культуралогіі [3] | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [4] | |
| Старшы выкладчык кафедры камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі | |
| Старшы выкладчык кафедры камунікатыўнага дызайну | |
| Старшы выкладчык кафедры інфармацыйных тэхналогій | |
| Старшы выкладчык кафедры культуралогіі | |
| Старшы выкладчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, д. 5, кабінет 208; да 17 ліпеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, д. 5, кабінет 409а; да 16 жніўня.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры сацыяльнай камунікацыі [5] | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 17 ліпеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 16 жніўня.

**«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ»
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД:**

Лабараторыя нанаэлектрамагнетызму
Вядучы навуковы супрацоўнік – 1 чалавек,
Старэйшы навуковы супрацоўнік – 1 чалавек.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220006, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 17 352 42 31.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 18.06.2025 г.
Зак. 534. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by